**Uwagi do realizacji:**

*Konspekt zawiera propozycję wprowadzenia tematyki przyrodniczej na lekcjach języka białoruskiego w oparciu o twórczość białoruskiego pisarza należącego do stowarzyszenia literackiego „Białowieża".
*Proponowane polecenia do lekcji można zmieniać, dopasowując do poziomu kształcenia, wiedzy i zaangażowania uczniów.
*Realizacja tematu: 1 -2 godziny lekcyjne.

## Temat: Свет прыроды ў творы Міхася Шаховіча "Смерць валошкі".

1. Cele ogólne lekcji/ ogólne założenia lekcji
   - poznanie treści utworu „Śmierć wałoszki",
   - poznanie nazw roślin, zwierząt w języku białoruskim,
   - poznanie części pogrzebowych zwyczajów / obrzędów
   - zrozumienie symbolu chabra w literaturze białoruskiej.

2. Cele nauczania

**E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-I Świadomość własnego dziedzictwa narodowego lub etnicznego. Uczeń:**
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-I.1 analizuje różne wzorce postaw społecznych, narodowych, obywatelskich, obyczajowych, kulturowych, moralnych, religijnych i w ich kontekście kształtuje swoją tożsamość;
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-I.2 rozumie tematy, motywy, toposy charakterystyczne dla literatury narodowej;
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-I.3 rozumie związek poznanych utworów z życiem narodu i różnych grup wspólnotowych;

**E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-II.3 Komunikacja językowa i kultura języka. Uczeń:**
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-II.3.4 świadomie korzysta z zasobów internetu, w tym multimedialnych, np. z: bibliotek, słowników on-line, wydawnictw e-book, autorskich stron internetowych twórców; dokonuje wyboru źródeł internetowych, uwzględniając kryterium poprawności rzeczowej oraz krytycznie ocenia ich wartość, przestrzega praw bezpieczeństwa w sieci;

**E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-II.4 Odbiór przekazu językowego. Uczeń:**
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-II.4.4 odczytuje sens tekstów artystycznych, (…) uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte;
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-III.1.9 wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, podtytuł, puenta, kompozycja, słowa klucze, motto);
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-III.1.10 wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: (…) kulturowy, filozoficzny, biograficzny;

**E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-IV.2 Pisanie. Uczeń:**
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-IV.2.6 wykonuje różne działania na tekście cudzym (np. streszcza, parafrazuje, (…), cytuje, sporządza przypisy);
E3-LO-JMNIEJ-2.2-ZPODROZ-IV.2.7 uwzględnia w interpretacji potrzebne konteksty, np. biograficzny, historyczny

3. Metody i techniki nauczania i uczenia się
   praca z tekstem , dyskusja , indywidualna,
4. Formy pracy na lekcji: grupowa równym frontem, indywidualna zróżnicowana, jednolita
5. Środki dydaktyczne – karta pracy z tekstem omawianego utworu oraz pytaniami do tekstu.

Tok lekcji:

I. Faza przygotowawcza

Sprawdzenie obecności.

Zapisanie tematu na tablicy: **Свет прыроды ў творы Міхася Шаховіча "Смерць валошкі".**

Wstęp: Што гэта валошка? Ці ведаеце іншую назву па-беларуску?

На сённяшнім уроку мы пазнаёмімся з творам Міхася Шаховіча пад загалоўкам «Смерць Валошкі». Твор прачытаем, патлумачым лексіку, пералічым назвы раслін, звяроў, якія паяўляюцца ў творы і задумаемся над сімволікай паэмы.

У творах беларускай літаратуры вельмі часта сустракаем прыклады выкарыстання раслінных матываў. Адным з такіх твораў з'яўляецца паэма Міхася Шаховіча, са зместам якой пазнаёмімся сёння.

**Кім быў Міхась Шаховіч?**

Нарадзіўся ў 1953 годзе ў сялянскай сям'і.

Скончыў беларускі ліцэй у Бельску Падляшскім у 1972 г. і паступіў на аддзяленне беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта.

Працаваў журналістам у беларускім тыднёвіку «Ніва», дзе ў 1974 г. задэбютаваў вершам.

Жыў у Беластоку, там і памёр у 2000 г.

Пахаваны ў Беластоку на гарадскіх могілках, а на надмагільным помніку запісаныя словы з ягонага верша:

**„Усіх нас калісьці згэтуль вецер адкіне. Важна б — застаўся след у каляіне, і травы шапталі б успаміны ў даліне, і чырвані спелай не ўкралі б у каліны, і спевы плылі б аб прышласці нашай..."**

Словы гэтыя несумненна сведчаць аб вялікай прывязанасці, сувязі іх аўтара з акружаючым светам прыроды.

Далей чарговы доказ на тонкае ўспрыманне аўтарам навакольнай прыроды - прыгадаем фрагмент вядомай паэмы гэтага белавежца (пісьменніка літаб'яднання Белавежа) - Міхася Шаховіча:

**„ … Гаварыць**
**Не ўмею**
**І не ўмеў**
**Я ніколі.**
**Маёй мовай —**
**Калоссе**
**І валошкі**
**У полі.**
**Мае думкі,**

**Як сад**
**Усёзялёнай <u>магноліі</u>. …”**
(з паэмы пз. „Святы лес”)

Вышэй прыведзяныя фрагменты гэта толькі кропелька прыкладаў, якіх можна было б тут множыць без канца. Таму лічу, што творчая спадчына Міхася Шаховіча вельмі добра адлюстроўвае ўяўленне беларускга народа аб чароўным свеце між іншым раслін. На пацвярджэнне прачытаем фрагмент яшчэ адной паэмы гэтага ж белавежца.

Раздаць карткі са зместам паэмы і пытаннямі да твора.

II. Faza realizacyjna

Настаўнік чытае твор паясняючы невядомыя словы і запісваючы іх на дошцы.
Pytania do tekstu:

1. Выпішы назвы раслін, якія паяўляюцца ў тэксце. Адшукай іх у інтэрнэце і намалюй у сшытку.
2. Пра якія рэлігійна-культурныя звычаі / абрады ўспамінаў аўтар у паэме? (заручыны, вяселле, споведзь, хаўтуры, стаялі на каленах ля труны, палілі грамнічныя свечы (тут „гарэлі зоры”), плакалі-галасілі (тут сава), да ўсопшае ішоў айцец - святар з рэчамі (тут месяц), над труной чыталі псалтыр і спявалі песні / „плылі спевы за ўпакой”)
3. Свет прыроды - расліны, звяры, з'явы прыроды маюць чалавечыя рысы. Як яны прадстаўлены / паказаны? Як яны сябе паводзяць? Выпішы ўсе прыклады.

   ( - валошка задрыжала, пахіснулася, падала, уся ў агоніі;

   - конь спатыкнуўся, захроп ядуча,

   - конь наровіцца пад лейчынай,

   - вока наліваецца крывёй;

   - жаўрук захліснуўся песняю;

   - жыты каласы павесілі;

   - кнігаўка-плачка захліпала шчыра, па-дзіцячаму; …

4. Як думаеш, чаго сімвалвам можа быць загаловачная "валошка"?

<u>Хатняя праца</u>

Даведайся ад старэйшых жыхароў Падляшша, як звалі / завуць расліны, якія паявіліся ў тэксце ў народзе па Падляшшы і да чаго іх выкарыстоўвалі ў жыцці.

III. Faza kontrolna

Вучні чытаюць свае адказы, папаўняюць інфармацыі, запісваюць іх на дошцы.

*Міхась Шаховіч*

**Смерць валошкі**

***паэма***

**1**

Задрыжала,
Пахіснулася,
Быццам
Сіняе неба
Падала.
Спатыкнуўся конь,
Захроп ядуча.
Жаўрук
У небе
Захліснуўся песняю,
Захліпала
Кнігаўка-плачка
Шчыра, шчыра,
Па-дзіцячаму.
А яна
Уся ў агоніі,
А яна блакіт
Усё траціла.
У неба
Птахамі
Узляталі
Вольныя,
Што
Надзеі адцураліся.
Па-над пожняю
Шыр і воблакі,
А тут сінь
З зямлёй зліваецца.
Конь
Наровіцца пад
лейчынай,
Крывёй
Вока наліваецца,
І каса
Так злосна енчыць...
А яна
На руках злені
Ціха
Небу спавядаецца:
- Зжалі тыя,
Што не сеялі!
Аб'ядналі
Не з'яднаўшыся!
Пройдуць вёсны,
Лета вернецца
Што ж вяселле
Без заручын?
І заснуў
На пожні-покуці
Сіні сімвал
Белай Русі.

**2**

Ля труны
Лугі
На калені ставалі,
Крываўнік збялелы
Залівався расой,
Горка
Палын
На мяжы задыхаўся,
І зоры
Гарэлі
Грамнічнай красой.
Галасіла сава -
Уладарніца ночы,
І крот
Падзямелле ўзнімаў.
Месяц - айцец
Цішыні і спакою -
Да ўсопшае
З рэчамі ішоў.

Цвыркун

На сцябліне

Уцалелага жыта

Псалтыр

Да заранкі

Чытаў над труной.

У манаскай задуме

Схіляліся дрэвы,

І спевы

Плылі за ўпакой.

**3**

Мы

Не блукалі

У пошуках

Выспы

Тут

Нашых продкаў

Бурлілі крыніцы.

З іх напіўшыся,

Да сонца

Тут выйшлі.

Гады

Не цешылі,

Дні

Не песцілі нас.

Мы часцей

Разыходзіліся,

Чым

Сустракаліся.

Білі

Нас словамі,

Білі

Нагайкамі.

Білі

Па мове

І

Па гісторыі.

Са смутку

Цешылі,

Як дзяцей,

Байкамі.

Кармілі ў голад

Пустымі

словамі.

Не раз

Ашуканы,

Не раз

прамераны.

У сваёй наіўнасці

Ізноў

Паверылі

У важнасць

імкнення.

З надзейнай

Гордасцю

Зноў у падарожжа -

Краіну Добрую.

**4**

І сніш

Ты аб небе.

Усё клічаш.

Вясёлку.

Шукаеш блакіту

У шэрасці

Мёртвай

Ідзеш ты

За словам,

Як Бог

За народам,

Туды,

Дзе ніколі

не будзе нязгоды.

І марыш

Спыніцца,

Ўсім

Сэрцам жадаеш,

У ценю свайго
Беларускага краю.

**5**

Неба
Сёння нервовае
Неба
Сёння хвалюецца,
Хмара
на хмару
Маланкамі шчэрыцца,
Дзікая конніца
Мчыцца
Вогненнай вуліцай.
Бела-белыя коні,
Ездакі
Да грыў туляцца,
Узняты
Меч над галовамі
Значыць
Вольную вуліцу.

**Pytania do tekstu:**

1. Пра якія рэлігійна-культурныя звычаі / абрады ўспамінаў аўтар у паэме?
2. Выпішы назвы раслін, якія паяўляюцца ў тэксце.
3. Свет прыроды - расліны, звяры маюць чалавечыя рысы. Як яны прадстаўлены / паказаны? Як яны сябе паводзяць? Выпішы ўсе прыклады.
4. Як думаеш, чаго сімвалвам можа быць загаловачная "валошка"?
5. Хатняя праца

   **Даведайся ад старэйшых, як звалі / завуць расліны, якія паявіліся ў тэксце ў народзе па Падляшшы і да чаго іх выкарыстоўвалі ў жыцці.**